Ба 227 342
Отд. VII
20040

МАЛАДНЯК

# СЛУЦКІЯ ПЕСЬНЯРЫ

ВЕРШЫ

[illegible]

Ба 227342

аб 88291

Ба 227342

# СЛУЦКІЯ ПЕСЬНЯРЫ

## ВЕРШЫ

— ИЮН 1968

Г02170

VII

20040

Бел. аддзел 1994 Б

ВЫДАНЬНЕ ЦБ МАЛАДНЯКА
МЕНСК—1926

1-я Дзяржаўная друкарня
Заказ № 1.007
У ліку 2.000
Галоўлітбел № 14.061

ОДЕССКАЯ ГОРОДСКАЯ
12 СЕН 1926
ПУБЛИЧНАЯ БИБЛИОТЕКА

227342

10.02.2010

Дзяржаўная
бібліятэка БССР
імя У. І. Леніна

# ПРАДМОВА

12-мільённы беларускі працоўны народ, рабоча-сялянскія масы хаваюць у сабе шмат талентаў, шмат вялікіх здольнасьцяй. Да Вялікага Кастрычніка паасобныя хлапцы і дзяўчаты вясковыя маглі разьвінуць свае здольнасьці і накіраваць іх належнай пуцінай выпадкова. Хоць ужо шмат казалася, але і яшчэ раз варта успомніць: царская ўлада не зацікаўлена была ў выяўленьні гэтых талентаў. Калі мы бачым факт зьяўленьня ў нас вялікіх поэтаў, як Янка Купала, Якуб Колас, дык можам тут-жа, словамі Якуба Коласа, зазначыць:

...Колькі талентаў зьвялося,
Колькі іх і дзе ляжыць
Невядомых, ня прызнаных,
Неаплаканых ні кім,
Толькі ветрам адсьпяваных
У полі посьвістам пустым...

Ці так гэта? Глянем на наш Капыль (Случчына). Чым тлумачыцца той факт, што з Капыля вышла аж 7 поэтаў, а з Барысава, прыкладам кажучы, або з якога другога месца—ніводнага. Няўжо гэта месца само па сабе „больш таленавітае?“ Не, зусім не. У Капылі праз увесь час існавалі беларускія палітычныя гурткі і інш., што давала імпэт да вылучэньня паасобных талентаў.

У нашы дні, у часе стварэньня новага жыцьця—новыя таленты выяўлююцца больш плянава—выпадковасьць паступова зьнішчаецца.

У галіне прыгожага пісьменства „Маладняк“ робіць вялікую працу. Факт заснаваньня па ўсёй Беларусі маладнякоўскіх філій і гурткоў — культурных асяродкаў — гаворыць шмат аб чым. Каля гэтых асяродкаў гуртуецца моладзь. Гуртуецца моладзь, якая прышла ад саламяных стрэх, ад закураных хат.

Атрымоўвае рады, атрымоўвае таварыскую дапамогу, магчымасьці нормальнага разьвіцьця.

Частцы хлапцоў, дзяўчат, якія прыходзяць, часта трэба даць рады заняцца іншай працай, а ня пісьменствам. Частку—заахвочваць да далейшай упартай працы над разьвіцьцём свайго таленту, бо бяз гэтай працы нічога быць ня можа. Гэта не асноўнае ў працы „Маладняка“, як аб'яднаньня, але гэта адна з яго істотных галін.

Вось і Слуцкая філія. Яна ў траўні месяцы 1925 году заснавалася. Цяпер налічвае ў сваіх шэрагах каля 10 сяброў.

І гэты невялічкі зборнік поэзіі паказвае чытачу плён працы першай групы—чатырох сяброў.

Немагчыма тут спыняцца на аналізе гэтых твораў—усё ў свой час. Але трэба падкрэсьліць зараз-жа і падкрэсьліць яскрава: *маладыя песьняры на правільнай дарозе.*

Социяльнае пахаджэньне, грамадзкая праца палажылі свой адбітак на творчасьці: Праца, Змаганьне і Будаваньне Социялістычнай Рэспублікі—вось асноўныя тэмы.

Не „кра-патрыотызм“, не перапевы агульных думак, а мастацкі адбітак жыцьця, рознастайнасьць рытмаў, рознастайнасьць мэлёдый—вось кароткая характарыстыка іх.

Зразумела,—гэта заўважаць і шаноўныя чытачы,—трэба працаваць маладым поэтам, трэба скарыстаць дасягненьні ранейшыя і даць да гэтага сваё новае,—вось шчырая наша рада слуцкім таварышам.

Іншыя маладняковскія філіі павінны прыгледзецца да творчых дасягненьняў Слуцкай філіі, у якой, як кажа Янка Відук:

...Колькі волі, магутнасьці ў ім
і размаху,
Колькі будучых дзеяў відаць...

І ўжо, як заклік да ўсіх сталёвых маладняковскіх когорт, да ўсёй рабоча-сялянскай моладзі нашай няхай гучаць словы поэты:

...Разьвівайцеся-ж, крыльле арлі-
ныя, гонка,
Разьсякайце размахам сваім ня-
быцьцё!
Няхай песьня ліецца магутная
звонка,
Няхай шчасьцем сьмяецца жыцьцё!

*(Я Відук).*

**Рэдакцыйна-выдавецкі аддзел**
**ЦБ Маладняка.**



Паўлюк Шукайла

## РАСЬЦЬВІЛО

*Н. С. Б.*

Расьцьвіло
лістом зялёным
сэрца
у той дзень,
калі вокам
ты глыбока
мне сказала:
вер...

Расьцьвіло,
абліта сокам,—
не цалункам,
не..
Ў ласцы
шчырай,
сінявокай
адчуваў я:
вер...

БССР Дзярж. бібліятэка імя Леніна

Расьцьвіло
у жнівень цёплы,
і карэньні
        йдуць глыбей...
Хоць-жа сьнежань
        сьцеле коўдру,
але чую тое-ж:
        в е р...

1/XII 1925 г.
г. Слуцак.

## ДУМКІ АСЕНЬНІЯ

Ды чаму ты,
лета пяклівае,
уступіла
той пары,
калі дні
хмура-дажджлівыя,
калі восень
ды сьцеле
свае дываны?

Эх, сонца,
чаго ты
        схавалася?
Выйдзі,
        зірні...
Праменьнем
        цалуйся з абшарам.
Хочацца мне,
каб ты углядалася,
а хмары...
гані, гані...

А ты, бярозка,
чаго пажаўцела,
зялёнасьць
каму аддала?
Красуняй
учора глядзела,
а сёньня—
як тая ўдава.

А поле,
каласістае поле,
дзе-ж тваё хараство?
Учора
жніво ў вочы біла,
сёньня—
іржышчам
прад вачыма
прашло.

Дык чаму-ж ты,
лета пяклівае,
уступіла
той пары,
калі дні
хмура-дажджлівыя,
калі восень
ды сьцеле
свае дываны?

Кастрычнік 1925 г.
Слуцак.

## ПЕСЬНЯ ЖАЎРА

О, як многа крыўды,
О, як мала слоў!

*(Ул. Дубоўка „Апошняя песьня“)*

Была вясна
маладая,—
раньняя вясна.
Песьціў вецер
кветкі подыхам,—
мілавала іх
сонца рука...

Ўсё жыло
жыцьцём вясновым.
Убіраўся ў зелень дол,
і шапталі
ў сініх далях
песьні клёны:
—Эх,
каб вышай
у абшар,
далей!

Мог-бы там
пазнаць жыцьцё,—
вясну сьпяваць,
сьпяваць званчэй
і ўсё ляцець
вышэй
вышэй...

Так жаўра гонкі
марыў,
Але, што гэта?
Груган
нырнуў з-за хмары...

Забілася моцна
сэрца у жаўра:
ляцець
ці не?
Імкнулі думкі роем...
І ў трывозе
ён рашыў:
ўладаць жыццём
удвох мы можам...
Напрамак—
ўвысь
бліжэй
да сонца...

І сэрца білася
так моцна,
        моцна...
Зусім ня тое
ў думках
у312гругана.
Ён кіпці
распусьціў,
крыві жадаў,—
агнём
        вочы засьвяцілі,
сьціснуў
        сталі-крыльлі...

. . . . . . . . .

І куляй зьнік у шыры.

. . . . . . . . .

. . . . . . . . .

* * *

І сьпяваў жаўра,
калі
кіпці ахапілі:
— З вясною,
мілы сябра,
паляцім
да сонца
на вяршыны.
Разам
падвойчым
пры палёце
сілы
і крыльлем
схопім
небасхіл
ды сіні...
. . . . . . . . . . .
. . . . . . . . . . .

І зьвінела песьня
па-над кручай,—
але штосьці пякуча
сэрца апаліла.
Гэта адважнага жаўра
глюга груганова
сьмерцю ахапіла...

. . . . . . . . . . . . . . .

. . . . . . . . . . . . . . .

Круцяцца
ў паветры
яго брацьця жаўры.
— Браточкі,
        ратуйце!—
Бяз моцы
        прасьпяваў ён.

І чулася
песьня
радзімых жаўраў:
— Зачым высока
ты нёсься?..

І сабраўшы жаўра
апошнюю натугу,
паюнацку рвануўся
з-пад чорнага груга...

Пярынкі ў ветры...
Крыві мала...
Усё ў ранах,
але сілы дала
воля жаўру.

Да сонца
нясецца йзноў.
Крыльлі песьня
разьвязала:
„О, як многа крыўды,
о, як мала слоў“,
сэрца жаўра напявала.

23/XII 1925 г.
Слуцак.

## ДУМКІ АБ БАЦЬКАЎШЧЫНЕ

„Сыночак, ня сумуй, прыйдзе
час—пабачымся“.

*(З лісту бацькі).*

Разьвітала мяне
ночка цёмная...
Помню,—
жыта шалясьцела скрозь,
мяжа
бур‘яніста-зялёная
была мне падарож.
Не забуду ніколі
браточка,
што апошні
сказаў мне:
— бывай!..
Жыві вольна
і нас у няволі,
Паўлюк,
не забывай.

227342

Дзяржаўная
бібліятэка БССР
імя У. І. Леніна

БССР Дзяржаўная ... імя Леніна

І па сёньнешні дзень
мяне душаць
братня-юнацкія словы.
Ой, не магу ды слухаць
зьвяк
ланцугоў
сталёвых!

І калі
выбух протэсту
гучыць
па савецкіх палёх,
мне ў ім
зацесна...
Туды-б!
каб толькі я мог?!.
Каб толькі я мог?!



Язэп Сукала

## ПАЛЁТ

Сьмяецца дзень вясёлым сьмехам,
і сонца косы, бы сіло,
зямлю ўплялі, а гучным рэхам
ў паветры штосьці загуло.

Сталёвы птах узьняўся ў неба,—
за ім другі...
За ім другі...
І рэжуць неба, быццам глебу,
сялянска-сінія плугі.
Нясуцца ў высь у ветра·хвалі
вышэй...
вышэй...
яшчэ вышэй.

Вось хмары іх ужо схавалі,
яны-ж ляцяць яшчэ вышэй.
Матораць там яны уволю.
Гудуць, равуць...
равуць, гудуць...
Вітаюць песьняй жоўта поле
і гутарку з бязьмежнасьцю вядуць.

Нырца адтуль і сьмехам льлюцца.
Уніз ляцяць...
Уніз ляцяць...
Над самым поплавам ўжо ўюцца,
ад сонца крыльлі зіхацяць.

Шырэй...
шырэй...
ў паветры хвалі.
Шырэй...
шырэй...
адзін, другі.
Дзе дзікі ветры бушавалі,
свае кладуць яны кругі.

## КІНЬ ТЫ ВОКАМ НАЎКОЛ...

*Прысьвячаю Янку Відуку.*

Кінь ты вокам наўкол па старонцы сваёй,—
у ёй мары збыліся поэты.
Той, хто ўчора стагнаў пад варожай рукой,
сонцам праўды ён сёньня сагрэты.

На палетках яе, хоць яны і ў дзярне,
ўжо хвалюецца рунь залатая;
заглушае бузу ростам дзіўным зярне
і цьвіце Беларусь маладая.

Дык, пясьняр малады, струны ты нацягні,
сьпявай песьню аб шчасьці і долі,
дзіўным зыкам яе—смутак сэрца гані,
каб схіляліся дрэвы да долу.

## І ЧАМУ Я НЯ ТОЙ...

І чаму я ня той
ручаёк цякучы,
што бяжыць у перабой
вадою бліскучай.

У разводзьдзе вясны
я ўзбунтаваўся-б,
і тады на заход
хваляю памчаўся-б.

Затапіў-бы я там
панскія палацы,
волю-б даў мужыкам—
дзецям цяжкай працы.

Нёмна—дзядзьку свайго
шчыра прывітаў-бы,
пра жыцьцё пра яго
хваляй запытаў-бы,

І тады па мяжы
бацькаўшчыны мілай
я-бы сьлед пралажыў
там сваёю сілай.

Я-б яе апавіў
срэбнаю істужкай,
вадой глебу ўспаіў
чыстаю, жывучай.

Дык чаму я ня той
ручаёк бягучы,
што бяжыць у пераб
вадою бліскучай.

# ЛЮБЛЮ...

Люблю цябе я, мшыстае палесьсе,
прастор і шыр няведамых балот.
Люблю смалісты пах ў хваёвым лесе,
люблю страчаць у ім я сонца ўсход.

Люблю ў часы вясновай, хмурай непагоды,
калі маланка блішча, гром грыміць,
і вецер сьвішча, важыць рэчкі воду,—
люблю за ёю моўчкі я сачыць.

Люблю пад сьпеў грымотны навальніцы
глядзець, як льлецца з цёмных хмараў пот,
як вецер рве ад вокан акяніцы,
са стрэх салому кідае за плот.

Люблю... бо ў гэтым гульбішчы прыроды
страшэнны дух магутнасьці чуцён...
Люблю яго я дзікі карагоды,
калі пачне гуляць у небе ён.

## ЗАВІРУХА

І стогне, і плача, і вые ўвакруг,
і ў даль завіруха нясецца,
і сыпле у вочы сьнег лёгкі, як пух,—
рагоча і скача й сьмяецца.
То ў лес яна мчыцца і там паміж хвой
дурэе з ялінкамі й сьвішча.
Затым у полі на волі пад сьпеў дзікі свой,
ўся нечысьць спраўляе ігрышча.
От ведзьма у ступе з мятлою ў руцэ—
дарогі усе замятае,
і з рогатам дзікім нясецца к рацэ,—
яе лесавік даганяе.
І ўзяўшысь за рукі, яны карагод
з песьнямі водзяць у полі.
То воўкам завыюць, пяюць, як чарот,
на цяжкую скардзяцца долю.
То ў песьні тэй сумнай парою чуцён
голас дзіцяці-нябогі!
— Вазьмі падарожны!—так просіцца ён,
і плачам зьбівае з дарогі.

То сьціхнуць ўсе ўсюды і толькі шумяць
стагоднія ў гаі яліны,
да з скрыпам сваім, нібы што гаманяць,
разносяць аб чым-та навіны.
От недзе далёка, бліжэй, ўсё бліжэй
песьню дзяўчаты сьпяваюць,
і песьняю тэй да болю грудзей
сэрца яны калыхаюць
і клічуць к сабе:
— Падарожны,
ты з дарожжа
утаміўся.
Сядзь ты, мілы,
ня траць сілы,
чаго зажурыўся.
Шлях далёкі,
адзінокі,
хто тут зможа?

Адпачынак
ля дзяўчынак
табе шмат паможа.
Пасьцель нову
пярынову
мы пасьцелем.
Сон чаканы
доўгажданы
песьняю навеем.
Сваім целам
мы сагрэем
тваё цела.
Дык ты, мілы,
ня траць сілы,
адпачні ў нас сьмела.
А я ўсё іду. Завіруха гудзе
і сыпле мне сьнегам у вочы...
То песьню пяе, як дудар на дудзе,
то скача, жартуе, рагоча.

# НА СЕНАЖАЦІ

Палае сонца ў сіняй далі,
праменьне шле яно на луг.
Паветра выгляд мае сталі,
яго калыша ветрык-зух.

Да краскі з краскі ляціць пчолка,
каб пасьпець мядку набраць.
Бо льлецца песьня ужо звонка,—
касцы прышлі на сенажаць.

І намяньціўшы свае косы,
сабою ўкрылі яны луг.
І за пракосамі пракосы,
кладуць, пастаўшы у ланцуг.

Толькі жарты, звон сталёвы
нясуцца ў высь, аж да нябёс.
Зірнеце, брацьця, касцы новы
будуюць сёньня жыцьця лёс!,.

Калыша ветрык траўку, кветкі,
касою сьцятыя ў пракос,
і дзіўны пах ды на палеткі
зладзюга-чмут ураз разьнёс.

А поруч рэчка срэбрам льлецца,
за хваляй хваля ў даль бяжыць.
Касцом прыветліва сьмяецца,
а промінь сонца ўсё дрыжыць.

## УСХОД

На выгане смугою сьцелецца
стары сівы дзедка-туман,
у праменьнях сонца ён песьціцца,
абвіваючы йстужкай курган.

Зямлю уплятаючы косамі,
сонца кранула і луг.
Прабеглі праменьні пракосамі,
замкнулі на іх яны круг.

Жартуючы з траўкай зялёнаю,
зьнялі з яе кроплі расы.
Прыветліва стрэлі сталёвую
песьню сялянскай касы.

Заглянулі з любасьцю мілаю
у твар загарэлы касцоў,
што песьняй сваёю зычліваю
слалі да сонца паслоў.

## РАНІЦАЮ

Эх, ты поле, луг зялёны,
да вас сёньня я іду
сустракаць усход чырвоны;
па расе сьляды кладу.

Як тут міла збожжа гнецца,
адбіваючы паклон,
сьпелым коласам сьмяецца —
і шуміць, шуміць прастор.

Тут блакітны васілёчак
мне паклон шле да зямлі,—
быццам просіцца ў вяночак
каб дзяўчаткі ўплялі.

Раптам песьню засьпявалі
жнеі, жыцейка жнучы.
Як зязюлі кукавалі,
пра край родны пяючы.

Эх, ты поле, луг зялёны,
да вас сёньня я іду
сустракаць усход чырвоны;
па расе сьляды кладу.



Апанас Атава



# МАЕ ДУМКІ—ТО ЖЫЦЬЦЯ ШАПТАНЬНЕ

Мае думкі—то жыцьця шаптаньне,
мае песьні—то сэрца біцьцё,—
тоны песьцяцца ласкай, каханьнем,
іх мэлёдыя—сьвежасьць палёў.

Мяне вёска сьпяваць навучыла,
мне пясьнярскую душу дала,
і распальвала кроў маіх жылаў
песьня вольная гмаху сяла.

Праца гарт мне дала свой сталёвы,
палажыла пячаць мазаля,
і пуцінаю ясна-ружовай
шлях адзначыла ў далі жыцьця.

Пот, што гаркасьцю еўся у вочы,
што сьцякаў па сьпіне ручаём,
маю песьню купаў, каламуціў,
бурных думак у ёй перагон,

БССР • Дзяржаўная імені Леніна 616-бібліятэка

А маланкі агнёвым блісканьнем,
пяруны стралянінай сваёй,
і шалёных віхур завываньне
мне натхненьня дарылі—агонь.

Сэрца молатам білася ў грудзях,
і маланкі красаліся з воч.
Стаць хацелася волатам-бурай,
пракалоць з краю ў край цемру-ноч...

Аганёк на начлезе дрыгучы,
зор скляпеньне у высі нябёс,
поплаў траўкаю сьвежай, пахучай
маю песьцілі ліру, мой сон.

Эх-жа ты, харасьво, маёй вёскі!
Табе песьню сваю я пяю.
Хай зьвініць карагод адгалоскаў,—
яны ўзяты з тваіх-жа сяліб.

## ВЫШАЙ...

Вышай, вышай к страсе
падымайся ты, цэп!
І ў снапы з непамерным размахам.

Засьвішчы, загудзі,
ды з размаху ўпадзі,
каб аж пошчак пашоў па-над дахам!

Бі, каб сноп ядраны,
яравы, аржаны,
ад удару твайго калаціўся.

Бо нядарам-жа ён,
залаты мой загон,
ў полі хваляй марской каласіўся.

Бі! Шырокі мой ток,
Каб салома, як шоўк,
стала мяккай, пляскатай, цягучай.

Я правею зярнё,
як пястун-дзіцянё
любавацьмуся буйнаю кучай.

Дык-жа вышай к страсе
падымайся, мой цэп!
Бі ў снапы з непамерным замахам!

Засьвішчы, загудзі,
ды з размаху ўпадзі,
каб аж пошчак прашоў па-над дахам!

# ЭЙ, ЗЬВІНІ

Эй, зьвіні, мая коска сталёвая,
ад мянташкі зьвіні!
Сёньня праца пасьпела ўжо новая —
вось зірні...

Хараством сваім кветкі любуюцца,
ў люстра неба глядзяць,
і ад подыху ветра цалуюцца,
пахацяць...

Паміж траваў кусты паўсядаліся,
чуць шапочуць лістом,
і здаецца яны закахаліся
хараством...

Разьляглося ты, сэрца прывольнае,
як кілім, сенажаць.
Вось дзе можна і моц сваю здольную
паказаць...

Вось дзе можна і плечы шырокія
на ўсю моц разьвярнуць,
вось дзе можна і грудзі высокія
адсапнуць...

Эх, сьвішчы, мая коска бліскучая,
па траве па густой.
Няхай хіліцца траўка пахучая
пад табой...

А я песьню магутную, звонкую
запяю, як поэт.
Няхай чуе мэлёдыю гонкую
увесь сьвет.

Няхай песьня касецкая коціцца,
на шырокі прастор,
няхай працаю—потам узносіцца
аж да зор...

Эй, зьвіні-ж, мая коска сталёвая,
ад мянташкі зьвіні,
сёньня праца пасьпела ўжо новая,—
вось зірні...,

* * *

Гэй, мой конік, ідзі на спачын,—
мы засеялі сёньня палоску.
Узрасьце, зарунее азім.
Вецер песьціць пачне яе косы.

Колькі радасьці будзе ў грудзях,
колькі шчасьця падзякі за працу.
Ой, буйная палоска мая,
будзеш ты каласамі згінацца!..

Я прылягу тады на мяжы,
любавацца пачну сваёй працай,—
о, як сэрцу захочацца жыць,
сьпяваць песьню вясны, а ня плакаць

Гэй, мой конік, хадзем на спачын,—
мы засеялі сёньня палоску,
ўсю кашулю мне пот прамачыў,
ды і ты натаміўся з ахвотай.

# МАЛАДНЯК

„Маладняк“—колькі ў слове адвагі і гмаху,
колькі палу!
        Яго не астудзіць вада.
Колькі волі ў ім і размаху,
колькі будучых дзеяў відаць!

        Разьвівайцеся-ж, крыльле арлініыя, гонка,
        расьсякайце размахам сваім нябыцьцё!
        Няхай песьня ліецца магутная звонка,
        няхай шчасьцем сьмяецца жыцьцё!

* *
*

Зьвінеце,
гудзеце,
званы-вястуны!
Вітайце чырвонае раньне.
Гукайце,
сьпявайце
вы песьню вясны,
Свабоды жыцьця і змаганьня.
Пра волю,
пра долю,
пра моц, пекнату,
пра здольнасьць бурліва гудзеце.
Высока,
далёка,
у даль-блазнату
сваю мілагучнасьць нясеце.

І рэхам
да стрэхаў
вясковай цішы,
да хат вы ляцеце няўпынна.
Бо многа,
дзіўнога
там схована ў чым,—
здружыць яно з вамі павінна.
Аб шчасьці,
аб працы,
пра дзею-дабро,
пра новую творчасьць сьпявайце,
Зьвінеце!..
Гудзеце!..
І новых сяброў
пад сьцяг маладняцкіззывайце!

# У ПОЛІ...

Віхор круціць кругом, вецер вые, гудзе,
гурбы сьнегу заблытваюць ногі,—
і вось гэтай парой маладзіца ідзе:
небарачка зблудзіла з дарогі.

Яна йдзе, але сілы кідаюць яе;
ногі здраджваюць... крок—і упала.
Закруцілася жвырам усё ў галаве,—
ціха, глуха яна прастагнала...

А мяцеліца горш і зласьней загула,—
сьнегам сьлёзы яе засыпала.
А мяцеліца песьню жудой завяла,
сум хаўтурны разносячы ў далі.

## ВЕЦЕР

Чаго гудзіш ты, вецер, так сярдзіта?
Нашто ты бор сталетні ўскалыхаў?
Мо' хіба ты яго так шчыра пакахаў,
што гутарку завёў з ім размаіта?

Чаго ляціш ты з шумам па абшары?
Чаго так дзьмеш шалёна на прастор?
Ўзьнімаеш гул ажна да самых зор,—
о ты, вястун сусьветнага пажару!



Янка Віпук.

## НАШЫ ПЕСЬНІ

Нашы песьні у краскі ўбіраюцца,
хараством новым ў сьвеце б'юць-звоняць;
з ветрам, подыхам ў далеч ганяюцца,
ды з працоўным народам гамоняць.

Яны гучнасьцю вельмі падобныя
звону косак вольнай краіны,
Пырскацяць весялосьцю аздобленыя
срэбрам-сьмехам чароўнай дзяўчыны.

Разьліваюцца ўзмахам павольным
у праменьнях, цудоўных яснотах.
І зьвіняць, і зьвіняць на прывольлі,
як касцы ў беларускіх балотах.

## ПАЛЮБІЛІСЯ МНЕ...

Ў Беларусі шумелі Кастрычніка хвалі...
Мая вёска глядзела ў мяцежную даль.
А ратаі там вольнасьць, надзеі хавалі,—
аджывала мінуўшчыны здань...

Шчыра вёска агортвала песьняй дзявочай
тады сына кужэльнай сям'і.
Загарэлася сэрца, сэрца ды вочы—
земляробам стаў жыць на зямлі...

З тэй пары у завульлі вясковым
спадабаліся сьпевы дзяўчат;
карагоды на сонцы вясковым
палюбіліся мне... Ой, гучаць!

Як вясною на прызьбе расьсядуцца
красуні-дзевачкі—любата;
ў гарыню шумы, зыкі ўзьнімаюцца,
як пачнуць песьні вёскі вітаць.

Песьні дзявочыя—вясельлі дзявочыя—
гымны гэтай працоўнай вясьне.
Вёска: як-жа ахвочы я
слухаць іх... Палюбіліся мне!..

# НА ПАЛЕТКУ ПА ДАРОЗЕ

На палетку па дарозе
ідуць жнеі ў вёску з жніва.
Усьміхаецца прыгожа
зорка з неба сіратліва...

Ідуць паволі; сіл набрацца,
адпачыць, а з зоркай раньняй
зноў у бойку вам кідацца
з гымнам працы і змаганьня.

Хто-ж вас шчыра прывітае
пасьля працы на пастаці?!
Песьня—адна песьня тая,
што злажыла доля-маці...

## ЖНІВО

Ніва, ніва,
як на моры
ходзяць хвалі.

Смагай, сумам
апавіты
вочы, далі.

Жнуць ды жнуць
паўстанцы працы
баявыя.

Пячэ сонца
і бясконца
сэрца ные.

Копы, поле
і прывольле—
вось уцеха!

Іх, бывае,
пацалуе
ветрык ціха.

А прыгнуцца,
замахнуцца—
люба глянуць.

Серп сталёвы,
люд вясковы...
Ўсталі—баюць.

І бясконца
пячэ сонца,
сэрца ные.

Жнуць ды жнуць
паўстанцы працы
баявыя.

## СТАРОНКА ВОЛЬНАЯ...

Стары гасьцінец... Зачаруешся яго магутным выглядам, першабытным хараством...

Шырокаю істужкаю зялёнай у высі, дарогаю ў пяць радоў уходзіць у далеч, віецца... Вакол яго разьляглiся пасёлкі, засьценкі і вёскі... Шуміць старэчына працяжна з вясёлым перахватам... Шуміць-гамоніць:

— Пражыў ня мала я і сьведкай быў стагодзьдзяў цэлых. Я шапкаю зялёнаю чужынцам ухмыляўся: Кутузаву, Наполеону, Пільсудзкаму...

Маёнткі тут, палеткі панскія з даўніх былі, і песьня чулася адна з году ў году гарачую, жніўную пару:

„А ў нас сёньня дажон, дажон,
Нашаму пану ражон, ражон"...

У сьлёзах, зьдзеках тут тамілася людзкое жыцьцё... І зусім інакш пачаў:

— Сьведкаю быў... Глядзі, што сталася з мяцежнікаў. Вакол, як вокам кінеш: краіна вольная будуецца...

О, Беларусь!



Іда Чырвань

## ЖЫТНЁВЫ ПРАСТОР

Выйду ў поле, дзе жыта-калосьсе,
акунуся ў яго я прастор.
Тут песьню пачуць давялося
на новы суладжаны строй.

У полі жытнёвую слухаць-бы казку,
шапацяць што у сінь каласы,
і глядзець-бы на пышныя краскі...
Птушкі пяюць ды на ўсе галасы.

Як іду у жытнёвым прасторы,
ап'яняюся ветрам лясным.
Дзе ні глянеш—ўсё неба ды поле,
каласы, каласы, каласы!..

## ЗАКАХАЛАСЯ...

Закахалася бурай, грымотай,
што бліскоча і б'е пяруном.
Закахалася сонцам, асокай,
працай вольнай, яе песьняром.

Закахалася вёскі саломай,
каласамі ячменю, аўса.
Прывітаньне ім шлю я з паклонам:
ў шапаценьні я іхнім расла.

Закахалася гораду шумам,
яго хваляй жыцьця – таўхатнёй.
Захапляе мяне гэты гоман,
акунуся ў яго з галавой.

Закахалася сьветам ад сонца,
зіхаценьнем праменьняў ад зор.
Сэрца поўна каханьнем бясконцым—
і складаюцца песьні ў узор.

227342
ab 88291
162120
Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна
179852

# З ь м е с т.


*Стар.*

Прадмова . . . . . . . 3
Расьцьвіло . . . . . . . 9
Думкі асеньнія . . . . . 11
Песьня жаўра . . . . . . 13
Думкі аб бацькаўшчыне . . . . 19
Палёт . . . . . . . . 23
Кінь ты вокам наўкол . . . . 25
І чаму я ня той . . . . 26
Люблю . . . . . . . . 28
Завіруха . . . . . . . 29
На сенажаці . . . . . . 32
Усход . . . . . . . . 34
Раніцаю . . . . . . . 35
Мае думкі—то жыцьця шаптаньне . . . 39
Вышай . . . . . . . . 41
Эй, зьвіні . . . . . . . 43
* * * Гэй, мой конік . . . . . 45
Маладняк . . . . . . . 46
* * * Зьвінеце, гудзеце . . . . 47
У полі . . . . . . . . 49
Вецер . . . . . . . . 50
Нашы песьні . . . . . . 53
Палюбіліся мне . . . . . . 54
На палетку па дарозе . . . . . 55
Жніво . . . . . . . . 56
Старонка вольная . . . . . 58
Жытнёвы прастор . . . . . 61
Закахалася . . . . . . 62

B0000003 138030

А. ТЫЧЫНА 25

Беларуская дзяржаўная бібліятэка
243

**ЦАНА 20 кап.**

О-30
Бел. аддзел
1994 г.
БССР
Дзяржаўная бібліятэка імя Леніна